# Ім Богам дадзены дар – тварыць



**Па сваёй натуры я чалавек не зайздрослівы. Не хварэю ад таго, што не маю шыкоўных дарагіх убораў, што не жыву ў катэджы і не езжу на супер аўтамабілі і г.д. Добрай зайздрасцю зайздрошчу толькі тым, хто надзелены божым дарам — здароўем і талентам — тым, хто прыгожа спявае, валодае мастацкімі і паэтычнымі здольнасцямі, словам усім тым, каму Богам дадзены нябесны дар. Аб некаторых талентах зямлі Хоцімскай, якім сапраўды можна пазайздросціць, коратка раскажу ў гэтым матэрыяле.**

Тамару Паўлаўну Журун ведаю даўно, яшчэ з тых пор, калі яна працавала метадыстам у дзіцячым садзе №2. Яе талент добра вядомы многім хацімчанам. Вырабы з саломкі, зробленыя рукамі Тамары Паўлаўны, упрыгожваюць многія кабінеты ў аддзеле адукацыі, у садку, у школах, у Цэнтры творчасці дзяцей і моладзі г.д. На якія толькі выстаўкі не прадстаўлялі яе работы, каму толькі не дарылі ў якасці сувеніраў — вялікім чыноўнікам далёка за межы вобласці і рэспублікі. І ніхто з іх, бадай, так і не даведаўся, чымі рукамі зроблена гэта прыгажосць — пано, прыгожыя кветкі ў кошыках і вазах, дзіковінныя жывёлы і лялькі і нават... жаночыя капелюшы. Апісаць прыгажосць яе вырабаў не хопіць слоў. Іх трэба бачыць, на іх трэба дзівіцца і лічыць за гонар атрымаць у падарунак.

І ніколі Тамара Паўлаўна не мела за такую прыгажосць, за нялёгкую, карпатлівую працу, якой прысвячае ўвесь свой вольны час, прыбаўкі да сваёй больш чым сціплай зарплаты, а зараз пенсіі. Нават у сваёй кватэры Тамара Паўлаўна не захоўвае ні адзін свой шэдэўр. І гэта ў час, калі многія, атрымліваючыя нават даволі добрую зарплату, не сарамеюцца гандляваць не зробленымі сваімі рукамі прадметамі сапраўднай прыгажосці, а рознай дробяззю, купленай-перакупленай, па без сораму завышанаму кошту.

Тамара Паўлаўна шчодра дзеліцца сваім уменнем з тымі, хто жадае ім авалодаць. Дзякуючы ёй, сакрэты майстэрства пазналі многія дзеці са школы-інтэрната, Цэнтра дзіцячай творчасці. Зараз Тамара Паўлаўна “падрабляе" нянечкай у сацыяльным прыюце для дзяцей, аказаўшыся ў экстремальных сітуацыях (дарэчы, прадаючы свае вырабы, яна мела б значна большы даход). І тут захапіла сваім “хобі" не толькі старэйшых, а і малышоў. Сыравіну (саломку), прэпараты для яе апрацоўкі і ўсе спадручныя матэрыялы набывае за сваю пенсію і ніколі нікога не папракнула ў гэтым, не папрасіла дапамогі, не запатрабавала аплаты. А магла б. Зробленыя рукамі дзяцей, пад яе кіраўніцтвам вырабы, нарасхват купляюць на школьных аукцыёнах, купілі б

з задавальненнем і многія хацімчане. Але Тамара Паўлаўна не прадае іх, а толькі дорыць...

* * *

Васіль Іларыёнавіч Мяшкоў цяжка хварэў, перанёс некалькі аперацый. У яго вялікія праблемы са зрокам, але ён не падае духам, не сядзіць склаўшы рукі і не скардзіцца на нялёгкі лёс. Яго захапленне дапамагае жыць, прыносіць радасць, упрыгожвае не толькі жыццё, а і кватэру, у якой жыве яго сям'я. Яна застаўлена дзівоснай прыгажосці мэбляй з лазы — гэта столікі, падстаўкі пад кветкі, крэслы. Яшчэ Васіль Іларыёнавіч займаецца разьбой па дрэву, робіць лінагравюры. У яго калекцыі — партрэты знакамітых людзей, дзівосныя палацы з запалак. Інтэр'еры жылля многіх сяброў, знаёмых Васіля Іларыёнавіча, таксама ўпрыгожваюць тварэнні яго залатых рук.

* * *

А колькі цікавых і незвычайных вырабаў з падручных матэрыялаў (нітак, паперы, кавалачкаў тканіны і г.д.) зрабілі пад кіраўніцтвам Алены Юр'еўны Валюжэніч навучэнцы другой сярэдняй школы. Урокі выяўленчага мастацва, якія вядзе Алена Юр'еўна, сапраўднае свята для многіх хлопчыкаў і дзяўчынак. Яна не толькі вучыць іх пазнаваць прыгажосць, а і дапамагае дзецям усвядоміць сутнасць мастацва, адкрыць яго цікавы свет. Колькі мам дзівілася адкрытым здольнасцям сваіх дзяцей, якія выявіла і дапамагла развіць настаўніца.

* * *

Плеценыя з лазы вазы, кошыкі, хлебніцы, вазы для садавіны Юрыя Міхайлавіча Шмялёва многія хацімчане ўбачылі на дабрачынным аукцыёне, які праводзіўся Цэнтрам дзіцячай творчасці ў дзень інвалідаў. Выгады ад іх продажу Юрый МІхайлавіч не меў. Ён аддаў свае вырабы бескарысліва, каб унесці свой уклад у высокародную справу — дапамагчы хворым і абяздоленым дзецям.

* * *

Афанасся Пятроўна Будзянкова жыве ў Баханах. Яе рукамі вытканыя і вышытыя ручнікі, сурвэткі, настольнікі, пакрывалы выклікаюць таксама пачуццё захаплення і зайздрасці. Прыгожыя рознакаляровыя тканыя ўзоры падобныя на вышыўку — вельмі рэдкае ў наш час майстэрства. Афанасся Пятроўна з задавальненнем прадстаўляла іх на раённую выстаўку прыкладнога мастацтва. Яе рукадзеллем прыходзяць палюбавацца аднавяскоўцы.

* * *

На Хоцімшчыне шмат тапенавітых людзей. Расказачь аб усіх у адным матэрыяле немагчыма. Хацелася б, каб тварэнні іх рук бачыла як мага больш людзей, каб нават можна было купіць спадабаўшаеся. Думаю, многія пагадзяцца з тым, што нядрэнна было б падтрымаць такіх людзей матэрыяльна, стварыць умовы для іх работы, адкрыць у гарадскім пасёлку пастаянна дзеючую выстаўку-продаж твораў мастацтва мясцовых умельцаў. І ішлі б мы тады купляць падарункі да святаў родным і блізкім не на рынак, а ў гэты магазін. Я думаю, многія б з задавальненнем набылі сапраўдныя

шэдэўры мастацтва замест таго, за што мы часта проста выкідваем грошы, купляючы ў камерсантаў.

**Ларыса ДАНІЛЕНКА.**

**На здымку: Т.П. Журун са сваімі юнымі вучаніцамі.**

**Фота**
**Святланы БАБРОВАЙ.**

**Даніленка, Л.** Ім Богам дадзены дар — тварыць / Ларыса Даніленка // Шлях Кастрычніка. — 2002. — 3 красавіка. — С. 2.